# СІНЕСТЭЗІЯ ЯК ЛІНГВАСТЫЛІСТЫЧНЫ ПРЫЁМ У АПАВЯДАННЯХ К. МЭНСФІЛД

**П. А. Сачывец**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*sochivetsp@gmail.com;*
*навук. кір. – М. С. Гутоўская, канд. філал. нав., дац.*

У артыкуле разглядаецца сінестэзія як міждысцыплінарны феномен. У прыватнасці, робіцца агляд даследаванняў, у якіх гэтая з’ява вывучаецца ў лінгвістычным кірунку (у тым ліку як лінгвастылістычны прыём). У адрозненне ад большасці даследаванняў, якія факусіруюцца на гукасімвалізме і гука-каляровай сувязі, у гэтым артыкуле на матэрыяле апавядання Кэтрын Мэнсфілд «The Garden Party» разглядаюцца некаторыя семантычныя катэгорыі (назвы колераў, словы, звязаныя з намінацыяй сэнсарных адчуванняў, лексічныя сродкі выражэння псіхічнай дзейнасці), адмысловае збыткоўнае выкарыстанне якіх спрыяе дасягненню эфекту сінестэзіі ў мастацкім творы. Творы Кэтрын Мэнсфілд (як і творы іншых прадстаўнікоў так званага «літаратурнага імпрэсіянізму») уяўляюць сабой перспектыўны матэрыял для далейшых лінгвастылістычных і псіхалінгвістычных даследаванняў.

***Ключавыя словы:*** сінестэзія; вербальная сінестэзія; Кэтрын Мэнсфілд; гукасімвалізм; літаратурны імпрэсіянізм.

Сінестэзія (ст.-грэч. συναίσθηση – σύν ‘разам’ + αἴσθησις ‘адчуванне’) – рэдкі нейралагічны феномен, пры якім рэакцыя на стымул у адной сэнсарнай сістэме выклікае міжвольны водгук у іншай сэнсарнай сістэме [10, с. 371]. З пачатка XX ст. гэты феномен прыцягваў увагу псіхолагаў і лінгвістаў, але таксама і дзеячаў мастацтва – мадэрністаў, якіх цікавілі эксперыменты з перадачай эмацыйнага і псіхічнага стану чалавека [4, с. 175]. На дадзены момант гэты феномен з’яўляецца міждысцыплінарным і вывучаецца не толькі нейралогіяй, але і псіхалогіяй, мастацтвазнаўствам, што дае падставу разглядаць два асноўныя кірункі даследаванняў – біёлага-псіхалагічны і літаратурна-мастацтвазнаўчы [5, с. 92]. З гэтага вынікае шматзначнасць паняцця ў навуковых працах з розных сфер даследаванняў [8, с. 4]. У гэтым артыкуле сінестэзія будзе разглядацца ў якасці лінгвістычнага і літаратурнага феномена.

Сярод тыпаў сінестэзіі, звязаных з моўнай сістэмай, вылучаюць, напрыклад, найбольш распаўсюджаную каларова-графемную (літары, лічбы

і іншыя сімвалы выклікаюць у індывіда ўяўленні пра іх колер) і калярова-фанемную (колеравыя асацыяцыі выклікаюцца гукамі маўлення, сустракаецца значна радзей). Дадзеныя тыпы сінестэзіі ў першую чаргу звязаныя з сэнсарнымі сістэмамі і з'яўляюцца рэдкімі і спецыфічнымі для сінестэтаў, але даследчыкі сцвярджаюць, што існуе і больш распаўсюджаная фундаментальная сувязь паміж мовай і пачуццямі. Некаторыя з сувязяў увасабляюць так званыя «сінестэтычныя метафары», якія сустракаюцца ў розных мовах: *цёплы/халодны колер, высокі/нізкі голас* [6, с. 75]. Так, на гэтай гіпотэзе базіруюцца даследаванні па метадзе «семантычнага дыферэнцыялу» Ч. Осгуда. Ён сцвярджаў, што семантычныя асацыяцыі могуць быць такімі ж аўтаматычнымі і міжвольнымі, як і пачуццёвыя. Р. Сайтовік, адзін з найбуйнейшых даследчыкаў гэтага феномену, насупраць, лічыць, што мова не можа быць сродкам, які выклікае сінестэзію, таму што мова – сацыяльная з'ява і не з'яўляецца прыроджанай, а моўныя асацыяцыі могуць быць унікальнымі для кожнай сітуацыі, тады як пры сапраўднай сінестэзіі яны фіксаваныя [11, с. 287]. Можна сцвярджаць, што некаторыя семантычныя катэгорыі выклікаюць рэакцыю, падобную на сінестэтычную, ва ўсіх носьбітаў мовы. Да гэтых катэгорый належаць у першую чаргу назвы колераў, словы, звязаныя з намінацыяй сэнсарных адчуванняў (гукі і іх інтэнсіўнасць, тэмпература, тактыльныя адчуванні) [10, с. 374]. Лексемы з вышэйазначаных катэгорый выклікаюць вялікую цікавасць у лінгвістаў і філолагаў. Даследаванні ў абсягу моўнай сінестэзіі ў асноўным факусіруюцца на такім пытанні, як гукава-каляровая сувязь (Р. О. Якабсон, А. П. Жураўлёў, Л. П. Пракоф'ева і інш.) [2; 7; 9].

Э. В. Коміна выкарыстоўвае паняцце «вербальная сінестэзія» і падкрэслівае, што гэта асаблівая праява феномена, таму што закранае не толькі першую сігнальную сістэму, але і другую, моўную. Любая лексема мае абавязковы план зместу, і гукавае (размова) ці візуальнае (чытанне) успрыманне слоў аўтаматычна выклікае пэўны сэнсарны водгук. Некаторыя лексемы маюць дадатковыя экспрэсіўныя канатацыі, што і з'яўляецца асновай прыёмаў сродкаў мастацкай выразнасці ў літаратуры. У гэтым сэнсе тэрмін «сінестэзія» набывае іншае, не першапачатковае (нейралагічнае) значэнне, і можа азначаць выключна лінгвастылістычны прыём [3, с. 84]. Для сінестэзіі як лінгвастылістычнага феномену характэрна метафарычная прырода: адбываецца перанос, характэрны для метафары, але перанос не па падабенстве, а іншага кшталту – з аднаго пачуцця на іншае. Да гэтага прыёму на фанетычным узроўні можна аднесці алітэрацыю і асананс, на лексічным узроўні – збыткоўнае выкарыстанне ў тэксце дзеясловаў са

значэннем фізічных і эмацыянальных адчуванняў, назваў колераў, на граматычным – увага аўтара да рытмічнага малюнка [12, с. 53].

Кэтрын Мэнсфілд (Katherine Mansfield, 1888–1923) – новазеландская і брытанская пісьменніца, вядомая сваімі кароткімі апавяданнямі [13, с. 215]. Некаторыя літаратуразнаўцы характарызуюць стыль яе пісьма як «літаратурны імпрэсіянізм» [12; 14; 17; 16]. Упершыню гэтае паняцце было выкарыстана пісьменнікам Фердынандам Брунецье (Ferdinand Brunetière), які тлумачыў яго як спробу перанесці сродкі выразнасці выяўленчага мастацтва ў літаратуру [14, с. 26]. У кнізе «Katherine Mansfield and Literary Impressionism» Джуліа ван Гунстэрэн вызначае найбольш адметныя рысы літаратурнага імпрэсіянізму. Яна падкрэслівае, што Мэнсфілд не спрабуе апісаць жыццё ва ўсіх яго праяўленнях, але робіць упор на перадачу ўспрымання свету чалавекам. Для дасягнення такога эфекту патрабуюцца асаблівыя лінгвастылістычныя прыёмы, сярод якіх можна назваць і сінестэзію, што можна растлумачыць менавіта зацікаўленасцю да ўнутранага свету чалавека, яго псіхічнага стану. Сродкі мастацкай выразнасці ў апавяданнях Мэнсфілд часта грунтуюцца на візуальным і эмацыянальным успрыманні навакольнага свету.

Намі быў праведзены частотны аналіз апавядання Кэтрын Мэнсфілд «The Garden Party» [15]. Як і можна было чакаць, самыя частотныя лексемы называюць з’явы раслiннага свету (тут і далей колькасць лексічных паўтораў у тэксце на 5375 унікальных лексем прыводзіцца ў дужках): *garden* (14), *green* (5), *flowers* (4), *lawn* (4), *leaves* (3). Часта сустракаюцца лексемы, што пазначаюць гукі (у тым ліку гукі маўлення, голас), слыхавое ўспрыманне: *voice*(*s*) (14), *say* (8), *tell* (8), *hear* (5), *sounded* (4), *sound*(*s*) (5); лексемы, звязаныя з органамі зроку і візуальным успрыманнем: *look* (15), *seemed* (11), *looked* (11), *eyes* (8), *seen* (4); назвы колераў і адценняў: *dark* (7), *black* (3), *shadow* (3), *light* (3), *blue* (2), *gold* (2), *bright* (2), *pink* (2), *pale* (2), *silver* (2), *white* (2), *brown* (1), *crimson* (1). Таксама можна вылучыць групу дзеясловаў нервовай дзейнасці: *thought* (6), *know* (5), *knew* (4), *felt* (5), *understand* (4); лексемы, якія перадаюць душэўны стан галоўнай гераіні і хуткую змену яе настрою: *quickly* (3), *hurried* (2), *fast* (2), *quick* (2), *agitated* (1), *desperate* (1), *anxious* (1). Такім чынам, у тэксце прысутнічаюць лексемы, якія накрываюць увесь спектр адчуванняў, акрамя смакавых і тактыльных, а таксама лексемы, якія адзначаюць эмоцыі і іх інтэнсіўнасць.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Ефименко Н. В.* Ассоциативная структура цветового значения слова и текста: звуко-цветовые соответствия // Вестник Челябинского государственного университета. 2010. № 46. С. 32–36.
2. *Журавлев А. П.* Фонетическое значение. Л.: ЛГУ, 1974.
3. *Комина Э. В.* Вербальная синестезия // Вестник Московского университета. Сер. 7. Философия. 2006. № 2. С. 83–95. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/ verbalnaya-sinesteziya (дата обращения: 20.04.2020).
4. *Комина Э. В.* Эстетика синестезии: к истории вопроса // Вестник культурологи МГУ. 2010. № 2. С. 174–175. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/e-v-komina-estetika-sinestezii-k-istorii-voprosa (дата обращения: 20.04.2020).
5. *Лосева С. Н.* Синестезия как междисциплинарный феномен // Вестник Кемеровского государственного университета культуры и искусств. 2018. № 44. С. 91–94. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/sinesteziya-kak-mezhdistsiplinarnyy-fenomen (дата обращения: 20.04.2020).
6. *Мукина О. Г.* Синестезия как лингвостилистический феномен // Муниципальное образование: инновации и эксперимент. 2010. № 2. С. 75–76. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/sinesteziya-kak-lingvostilisticheskiy-fenomen (дата обращения: 20.04.2020).
7. *Прокофьева Л. П.* Звуко-цветовая ассоциативность в языковом сознании и художественном тексте: универсальный, национальный, индивидуальный аспекты: автореф. дис. … канд. фил. наук : 10.02.19 / Рос. акад. наук, Ставропольский государственный ун-т. Саратов, 2009.
8. *Прокофьева Л. П.* Синестезия в современной научной парадигме // Изв. Сарат. ун-та Нов. сер. Сер. Филология. Журналистика. 2010. № 1. С. 3–9. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/sinesteziya-v-sovremennoy-nauchnoy-paradigme (дата обращения: 20.04.2020).
9. *Якобсон, Р.* К вопросу о зрительных и слуховых знаках // Семиотика и искусствометрия. Москва, 1972. С.82–87.
10. *Cytowic R., Ward J.* Synesthesia and Language // Concise encyclopedia of brain and language. 1st Edition. Elsevier, 2010. P. 371–376. URL: https://www.researchgate. net/publication/327108549_Synesthesia_and_Language (date of access: 20.04.2020).
11. *Cytowic R. E.* Synesthesia: A Union of the Senses. MIT Press, 2002.
12. *Gunsteren, van J.* Katherine Mansfield and Literary Impressionism. Amsterdam-Atlanta: Brill Rodopi, 1990.

13. *Janik V. K., Janik D. I., Sampath E.* Modern British Women Writers: An A-to-Z Guide. Westport, Connecticut: Greenwood Publishing Group, 2002.
14. *Kimber G.* Use of Literary Impressionism // G. Kimber. Katherine Mansfield and the Art of the Short Story. London, 2015. P. 26–32.
15. *Mansfield K.* The Garden Party (1921) // Katherine Mansfield Society. URL: http://katherinemansfieldsociety.org/assets/KM-Stories/THE-GARDEN-PARTY1921. pdf (date of access: 20.04.2020).
16. *Miao M*. Katherine Mansfield and Artistic Synaesthesia: Weaving Colour, Rhythm and Mood: th. for the Degree of Doctor of Philosophy in English. Auckland, 2015. URL: https://researchspace.auckland.ac.nz/handle/2292/27183 (date of access: 20.04.2020).
17. *Reimer M. C*. Katherine Mansfield: A Colonial Impressionist: th. for the Degree of Doctor of Philosophy in English. Canterbury, 2010. URL: https://ir.canterbury.ac.nz/bitstream/handle/10092/5289/Thesis_fulltext.pdf (date of access: 20.04.2020).